

**М. БАНДАРЭНКА**
бібліятэкар гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 4
ДУК "Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С. Пушкіна"

# "Чароўнае кола"

## Літаратурна-інтэлектуальная гульня

***Удзельнікі:*** вучні 4–6 класаў.

***Мэта:*** выхоўваць пачуццё гонару за родную мову і паважлівыя адносіны да роднай мовы і літаратуры.

***Абсталяванне:*** кола, 8 сектараў з карткамі, з аднаго боку якіх — літары В, К, А, С, З, Л, а з другога — пытанні і заданні; скрыпічны ключ, смайл; БУКВАРна-краязнаўчая выстава "Беларуска-мазырскі алфавіт"; інфармацыйны спіс-заданне па чытанню кніг "Гульня слоў"; жэтоны за правільныя адказы.

### Ход мерапрыемства

Дзень добры, маленькія беларусы і беларусачкі!

Мы жывем у слаўнай, прыгожай краіне, якая горда называецца Беларусь. Яна ў нас адна — самая родная, блізкая і незвычайная. Адметная сваёй прыродай, гісторыяй, культурай, традыцыямі, а яшчэ — гасціннасцю. І, канешне ж, мовай — мілагучнай і спеўнай, празрыстай і звонкай.

Мабыць, ёсць сярод вас тыя, хто чытае кнігі на беларускай мове, і гэта вельмі добра. Я заўсёды такога чытача хвалю: "Які ж ты малайчына!" Калі ты нарадзіўся беларусам, калі жывеш на зямлі Беларусі, то павінен шанаваць сваю родную мову, бо менавіта яна злучае людзей у адзіны народ. Згодны? Так лічым не толькі мы, у гэтым упэўнены ўвесь свет. У роднай мовы нават ёсць сваё свята — Міжнародны дзень роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага.

Сёння ў свеце налічваецца больш чым 6 тысяч моў. Але ж палова з іх пад пагрозай знікнення, і каб захаваць тыя мовы, якія знікаюць, і святкуюць Дзень роднай мовы. Людзі трымаюцца роднага слова, таму што яно — роднае, а не таму, што прыгажэйшае за гаворку суседзяў.

Запрашаю вас прыняць удзел у літаратурна-інтэлектуальнай гульні, якая адбудзецца дзякуючы чароўнаму колу. Глядзіце, тут 8 сектараў, у якіх замацаваны карткі са схаванымі на адваротным баку літарамі, ад якіх адыходзяць стрэлкі да пытанняў:

**В** — умоўнае скарачэнне слова "***в***ерш" (выразнае чытанне вершаў)
**К** — ***к***азка, пытанні для ***к***емлівых
**А** — ***а***збука, знаёмства з выставай "Беларуска-мазырскі ***а***лфавіт"
**С** — ***с***карагаворка
**З** — ***з***агадка



Бандарэнка, М. "Чароўнае кола" : літаратурна-інтэлектуальная гульня / М. Бандарэнка // Бібліятэка прапануе. - 2021. - № 9. - С. 5-10.

**Л** — **л**ічылка; **л**ічбы; **л**ітаратурная аптэка; **л**ітаратурная паштоўка; **л**ітаратурнае лата.

Таксама ёсць сектар "Музычная паўза" (сімвал — скрыпічны ключ) і сектар "Жартоўная гульня" (сімвал — усмешка).

Вы падзелены на 2 каманды. Прадстаўнікі кожнай каманды па чарзе будуць падыходзіць да кола, адкрываць адзін з сектараў і дэманстраваць усім сваю літару.

Вам трэба будзе адказаць на пытанні і выканаць заданні на літару, якую выцягніце.



### Літара "В"

Прачытаць выразна **в**ершы

*1 каманда*

**Родная мова**

*У горадзе, між ніў жытнёвых,*
*У важным доме, сціплай хаце*
*Не забывайце роднай мовы –*
*Для нас навек яна, як маці.*
*Каб свет чароўнай прыгажосцю*
*Вас ні на момант не пакінуў,*
*Шануйце мову не як госцю,*
*А як матулю, гаспадыню.*

Міхась Пазнякоў

*2 каманда*

**Роднае слова**

*Я "Роднае слова" да ночы вучу,*
*За кнігаю новаю спаць не хачу.*
*Мне бацька гаворыць:*
*— З навукай дружы,*
*Ты "Роднае слова", сынок, беражы.*
*І мову, што роднаю людзі завуць,*
*У шчасці і ў горы, глядзі, не забудзь.*

Вера Вярба

### Літара "К"

Успомніце, якія беларускія народныя ***казкі*** вы чыталі? З якіх казак узяты гэтыя прыказкі? Праўдзіце рысачкі ад прыказкі да казкі, з якой гэта прыказка.

| | |
|---|---|
| Жыццё пражыць — не поле перайсці. | *Ад крадзенага сытым не будзеш* |
| Ад крадзенага не пасыцееш | *Стары бацька* |
| І Кузьму бацькам назавеш | *Пан і казачнік* |
| Людзей слухай, а свой розум май | *Людзей слухай, а свой розум май* |
| Свет вялік, можа, і праўда | *Недалікатны сын* |

Пытанні для **к**емлівых

Хто што любіць? Назавіце любімы корм пералічаных тут жывёл, птушак і рыб.

*1 каманда*

| | |
|---|---|
| МЯДЗВЕДЗЬ | СЫР |
| ЗАЯЦ | ЧАРВЯКІ |
| КОТ | АРЭХІ |
| КАРОВА | ЗЕРНЕ |
| ДЗІКІ КАБАН | МЁД |

*2 каманда*

| | |
|---|---|
| ВАВЁРКА | МОРКВА |
| ВАРОНА | КАПУСТА |
| КАРАСЬ | СМЯТАНА |
| КАЗА | ЖАЛУДЫ |
| ВЕРАБЕЙ | СЕНА |

Падкрэсліце лічбы ў прыведзеных словах.

*1 каманда*

АДВАГА
ВІТРЫНА
ГАДЗІННІК
СТОЛІК
ПРЫПЯЦЬ
ЛІСТОК

*2 каманда*

СТРЫНОЖЫЦЬ
ПАДВАЛ
СЕМІНАР
СТРЫЖЫ
ТРЫБУНА
ГІСТОРЫЯ

Хован**к**і.

Літары беларускага алфавіту запісаны ў адвольным парадку, аднак сярод іх "хаваюцца" назвы беларускіх казак. Вам трэба знайсці схаваныя словы.

Кнігі-падказкі з назвамі казак на выставе.

*1 каманда*

АББАРАНКЎЦЙБОККТАБАДРАН
**АББАРАН**КЎЦЙ**БОК**К-**ТАБАДРАН**

ДЗЕДАВАМЗЧВРУКАВІЧКА
**ДЗЕДАВА**МЗЧВ**РУКАВІЧКА**

НЕШКСІЛАЙЦАМСЬРОЗУМАМ
**НЕ**ШКСІЛАЙЦАМСЬ**РОЗУМАМ**

ПШАНІЧНЫЦШККАЛАСОК
**ПШАНІЧНЫ**ЦШК**КАЛАСОК**

*2 каманда*
ЕАВВОЛШДЫУУАСЁЛ
ЕАВ**ВОЛ**Ш**ДЫ**У**УАСЁЛ**

СЫНОК-З-УШЕККУЛАЧОК
**СЫНОК**-З-УШЕК**КУЛАЧОК**

ШКЦЛІСАІМУЖЫКЦСЬ
ШКЦ**ЛІСАІМУЖЫК**ЦСЬ

ЯРПЗАЛАТЫСМЧПТАХ
ЯРП**ЗАЛАТЫ**СМЧ**ПТАХ**

Адказы можна знайсці ў выдзеленых словах.
Куды пайшоў **Алесь** на прагулку?

*(у лес)*

Што зламаў бык аб **парог**?

*(рог)*

Хто напалохаў **каралеўну** ў лесе?

*(леў)*

Што зварыла **Марыся** на абед?

*(сыр)*

Што любяць дзеці, калі заходзіць **сонца**?

*(сон)*

Якая кветка расцвіла ў садзе пад **гамаком**?

*(мак)*

Якую страву паставіў повар **насупраць** Дашы?

*(суп)*

Хто высунуў галаву з **ракі**?

*(рак)*

**Імёны.**

У прыведзеных словах схаваны імёны. Адшукайце іх.

*1 каманда*
МАКСІМУМ
РАМАНТЫКА
ШАВЯЛЮРА
КАВАЛЕРЫЯ
МІЛАН
АДАМКНУЦЬ
СВЕТАПОГЛЯД





*2 каманда*
ПРАГАЛІНА
ТАПОЛЯ
РАЗЛУКА
ЛІВАН
БАРБАРЫС
МАРЫНАД
МАНДАЛІНА

## ЛІТАРА “А”

Знайдзіце на выставе кнігу Віктара Кажуры “Маленькая азбука вялікай краіны”.

Хто скажа, колькі літар у беларускім алфавіце? (34).

*Па чарзе некалькі ўдзельнікаў з кожнай каманды выходзяць.*

Назавіце любую літару беларускага алфавіту.
Напрыклад, літара **А**.

**А**зёры.

*Пытанне:* што вы ведаеце пра беларускія азёры, успомніце іх назвы, характэрныя асаблівасці. Пасля абмеркавання адкрыць старонку на літару і зачытаць.

Беларуска-мазырскі **а**лфавіт.

Прапаную вам пазнаёміцца з кніжна-ілюстраваным даведнікам “Літары-брэнды роднай зямлі”, якія вы можаце ўбачыць на БУКВАРна-краязнаўчай выставе “Беларуска-мазырскі алфавіт”.

Алфавіт утрымлівае шмат цікавостак: у ім сабраны славутасці, вядомыя людзі, стравы, святы, архітэктурныя помнікі і людзі, якія пакінулі след у літаратурным жыцці і гісторыі Беларусі ў цэлым і Мазыра — у прыватнасці. На кожную літару прадстаўлены характэрныя беларускія словы, якія гучаць па-асабліваму і не маюць аналагаў у іншых мовах. Яшчэ тут ёсць сучасныя выканаўцы, фестывалі, падзеі і брэнды, без якіх немагчыма ўявіць жыццё нашай краіны. І галоўнае — кожнай літары адпавядаюць імёны сучасных беларускіх дзіцячых пісьменнікаў і паэтаў, кнігі якіх шчодра прадстаўлены на кніжных паліцах нашай бібліятэкі.

Краязнаўчая частка алфавіту — гэта своеасаблівая візуалізацыя мазырскіх фенаменаў, дзе літарам азбукі адпавядае якая-небудзь гарадская славутасць.

Літаратурная **а**птэка.

Падумайце, якія ёсць “хваробы” характару, чалавечых узаемаадносін і як дапамогуць іх “вылечыць” мастацкія творы.

*1 каманда*

Знайдзіце на выставе, а таксама ўспомніце і назавіце, якія творы могуць навучыць дабру?

*2 каманда*

У якіх творах можна знайсці падказку, як навучыцца радаваць бацькоў?

## Літара "С"

**С**корагаворка-галаваломка.

Перад вамі скорагаворка-галаваломка. Але напісана яна незвычайна. Адшукайце ключ да правільнага напісання. Запішыце і прачытайце скорагаворку.

КАРАЛ ІНАЛЯЛЬКУ ЮЛЮКЛА ПАТЛІ ВАКЛАЛА ЎЛЮЛЮ

*(Караліна ляльку Юлю клапатлівa клала ў люлю.)*

*Па 3 прадстаўнікі з кожнай каманды выходзяць і выразна чытаюць скорагаворкі.*

***1 каманда***

*Грымнуў гром угары,*
*Хлынуў лівень на двары.*

*Праз барвовы бярозавы гай*
*Серабрысты грукоча ручай.*

*Калі з маленства пашчыруеш —*
*Характар добра загартуеш.*

***2 каманда***

*У лясным гушчары ля ракі*
*Збудавалі бабры церамкі.*

*Сом прысніў жахлівы сон,*
*Як у сетку трапіў ён.*

*Вырасцілі Флор і Лора*
*Боб, фасолю, памідоры.*

**С**ловы розныя бываюць.

Знайдзіце на выставе кнігу Сторажавай Н. "Словы розныя бываюць".

Літары заблудзілі, давайце дапаможам ім вярнуцца ў свае словы. Чытаем па чарзе.

*Весела звініць зБанок,*
*Кліча: "Дзеці, на ўрок!"*

*Ліза мазі папрасіла: Лізу Вуха ўкусіла.*

*Малако дае карова,—*
*Напісаў на Кошцы Вова.*

*Не праедзеш, дружа:*
*На дарозе Ружа.*

*Закрычаў Рыгорка:*
*— З неба ўпала Горка!*

*Кажа Славік Светцы:*
*— Цесна тыгру ў кВетцы.*

*Горка плача Лена:*
*— Ой, баліць Палена!*

*Даганяюць восы!*
*Скінуў дзядзька Ноты –*
*Уцякае босы.*

*Пакідаю я футбол,*
*Гэта мой апошні Вол.*

*— Вось ён, Вожык, у кішэні,*
*Не згубіўся! — кажа Жэня. –*
*Сам вазьму і натачу:*
*У грыбы пайсці хачу.*

## Літара "З"

Адгадайце **з**агадкі:

*Стаіць пан пад ялінкай,*
*Сабе цану знае,*
*Ні перад кім*
*Шапку не здымае.*

*(Грыб)*

*Без фарбы, без алоўка*
*Малюе хутка, лоўка.*

*(Мароз)*

*Не агонь, ды апякае.*
*Хто яе, скажыце, знае?*

*(Крапіва)*

*Не малако, а белыя,*
*Не пчолы, а лятаюць,*
*Хоць малыя, ды смелыя,—*
*На вусны, на рукі сядаюць.*

*(Сняжынкі)*

*Далёка лятаюць малодкі,*
*Мёд збіраюць салодкі.*

*(Пчолы)*

*Перад зімой распранаюцца,*
*А як прыйдзе цяпло — апранаюцца.*

*(Дрэвы)*

"**З** многіх — адну".

Выбіраючы з кожнага слова адну літару (з першага — першую, з другога — другую, з трэцяга — трэцюю, з чацвертага — чацвертую, з пятага — пятую), утварыце новае слова, якое назаве мудрага сябра для ўсіх людзей.



КОЛАС
АНАНАС
СЛІВА
КРЫГА
АСІНА
*(Кніга)*

## Літара "Л"

**Лічбы.**

Знайдзіце на выставе кнігу "Лічба з літарай сябруюць" А. Зэкава. Уважліва паслухайце вершы і адкажыце на пытанні.

***1 каманда***

*Прачытала Света*
*Дваццаць кніг за лета,*
*На дзве меней — Галя,*
*На тры больш — Марынка.*
*Колькі ж прачыталі*
*Кніг на трох дзяўчынкі?*

***2 каманда***

*З матэматыкай нібыта*
*Сябраваць гатоў Мікіта*
*І рашыць задачу б мог,*
*Каб даведацца вось толькі,*
*Колькі будзе сем без трох*
*І без двух чатыры — колькі.*

**Дзяжурная літара.**

Я буду называць літары, а вы ўспамінайце аўтараў і назвы твораў, якія пачынаюцца з гэтых літар. Можна глядзець на выставу.

*Напрыклад:*
**В** — В. Вітка, А. Вольскі;
**Ж** — Я. Жабко, В. Жуковіч;
**М** — А. Масла, М. Маляўка і інш.

**Літаратурная паштоўка.**

Загадзя дзеці павінны былі прачытаць адзін і той жа твор і маляўніча аформіць паштоўку (з выкарыстаннем каляровай паперы і кардону, фарбаў, алоўкаў, прыроднага матэрыялу і г. д.). З адваротнага боку яны запісвалі назву кампазіцыі, адлюстраванай на паштоўцы, і па жаданні ўрывак з мастацкага твора, які адпавядае сюжэту.

**Літаратурнае лато.**

Рыхтуюцца карткі двух колераў. На адных запісваюцца пытанні па змесце вядомых мастацкіх твораў. На другіх — адказы на пытанні. Бібліятэкар зачытвае пытанне з карткі, той вучань, у якога знаходзіцца картка з правільным адказам, падымае руку і дае адказ, выходзіць да выставы і замацоўвае картку побач з пытаннем. Гульня працягваецца, пакуль на ўсе пытанні не будуць атрыманы правільныя адказы.

**Жартоўная гульня**

(на коле — сімвал у выглядзе *смайліка*)

Ці бывае так?

*Залівістыя песні на сасне*
*Кукуе нам сарока па вясне.*
*На Поўдні, дзе вечныя льды,*
*Пінгвіны і куры ідуць да вады.*
*Люблю на санках летам*
*Прамчаць з гары крутой,*




*А ў садзе дыхаць кветам*
*Марознаю зімой.*

*У вадзе жывуць вавёркі,*
*У дупле жывуць бабры.*
*Совы — у возеры глыбокім,*
*А самы — у густым бары.*
*Пчолы спяць зіму ў бярлозе,*
*А мядзведзі — у вуллі.*
*Конь спявае на бярозе,*
*Вераб'я ў плуг запраглі.*

*На бярозе спеюць грушы,*
*А на дубе — вінаград.*
*Кот грыбы на лузе сушыць*
*І частуе мышанят.*

*Селі акуні на плот,*
*На рамонку кот сядзіць.*
*На вярбе спявае крот,*
*У шпакоўні вожык спіць.*
*Вусень воз цяжкі вязе,*
*Свінка скокнула ў гняздзечка.*
*Па галінцы конь паўзе,*
*Куранят вядзе авечка.*

*Вось ды дзіва, вось дык цуд —*
*Кракадзіла з'еў вярблюд!*

*Сена з лугу пpыляцела*
*І ў хляве карову з'ела.*

*Вы не бачылі, не чулі?*
*Па сакрэту гавару:*
*Мышкі кошку зацягнулі*
*У глыбокую нару.*

*На рацэ маторнай,*
*Па глыбокай лодцы*
*Шчупакоў у мора*
*Вёз рыбак у бочцы.*

**Заданні для ўсмешкі.**

Камандам раздаюцца аднолькавыя карткі з заданнямі. Якая каманда хутчэй і без памылак адкажа на пытанні, атрымае на 2 жэтоны больш.



Назавіце мелодыю, якую любяць вучні ў канцы ўрока

*(конавз)*

Чым канчаецца даль?

*(ь йаратіл)*

Якая музычная нота патрэбна для супу?

*(ьлос)*

Без чаго хлеба не бывае?

*(ікныракс зеб)*

Пад якім кустом заяц спіць у дождж?

*(мырком дап)*

Што кусаецца, але не брэша?

*(авіпарк)*

Як назваць сухую траву чатырма літарамі?

*(анес)*

Назавіце імёны, якімі можна называць як хлопчыкаў, так і дзяўчынак.

*(ашаС, янэЖ, ялаВ, авалС)*

Назавіце словы, у якіх сто зычных.

*(лотс, готс, нготс, сотс)*

Што ўсіх нас робіць людзьмі?

*(авом)*

Ты, я, ды мы з табой. Колькі нас усяго?

*(еовд)*

Вы ўсе малайцы, разам мы ахапілі творы з усіх сектараў чароўнага кола. Вы паказалі сябе добрымі знаўцамі роднай мовы і літаратуры. Дзякуй за гульню і за шчырыя ўсмешкі!

**Літаратура**

1. Вясёлка: вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. М.А. Маляўка. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2012.— 279 с.

2. Пазнякоў, М.П. Гульня слоў: гульні з літарамі і словамі / Міхась Пазнякоў. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011.— 128 с.

3. Залаты птах: беларускія народныя казкі / уклад. Аксаны Спрынчан; іл. Надзеі Барай. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2018.— 126 с.: іл.

4. Зэкаў, А.М. Лічба з літарай сябруюць: ПРАВІЛьныя вершы, загадкі-задачкі: для мал. шк. ўзросту / А.М. Зэкаў; маст. Р.В. Кульба. — Мінск: Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016.— 48 с.: іл.— (Сучасныя пісьменнікі — дзецям)

5. Буторына, І.А. Урокі "Вясёлкі" / І.А. Буторына. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2017.— 207 с.